# Алмаз становіцца дыяментам



Ідзе будоўля бібліятэкі.

***Беларусь будуецца. Толькіў рашах Дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмы налета павінны быць уведзены ў эксплуатацыю каля 200 новых аб'ектаў. Але ў гэтым змястоўным спісе ёсць новабудоўля, увага да якой з боку ўладаў і грамадскасці носіць выключны, пастаянны характар. І вельмі прыемна, што неўзабаве яна павінна ператварыцца менавіта ва ўстанову культуры.***

Новы будынак Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі не толькі зробіць доступ усіх ахвочых да інфармацыі больш зручным — яго сховы будуць разлічаны на 14 млн. бібліяграфічных адзінак, а колькасць чытацкіх месцаў дасягне ажно 1850 чалавек. Мала ў каго ўзнікаюць сумневы, што гэтаму 23-паверховаму гмаху, які нагадвае сваёй формай алмазны крышталь, наканаваны лёс аднаго з найгалоўнейшых сімвалаў сталіцы. І таму нядзіўна, што ход будаўніцтва хвалюе не толькі тых, хто задзейнічаны ў ім непасрэдна.

Насуперак чуткам, якія разпораз псуюць мінчукам настрой, а таксама суцэльным непаразуменням з надвор'ем, будоўля ідзе належнымі тэмпамі. Пасля таго, як на пачатку снежня было зманціравана цэнтральнае ядро, у лёсе будаўніцтва наступіла пэўнае прасвятленне, і сумневы наконт таго, што яно будзе скончана ў вызначаны тэрмін, нічым не абумоўленыя. Бо этап працы, які лічыўся спецыялістамі найскладанейшым, быў паспяхова завершаны.



Праект Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

...Мы аглядалі новабудоўлю ў адзін слотны снежаньскі дзень. Складаная канструкцыя, якая заняла ладную частку былой пусткі ля станцыі метро "Усход", пакуль не можа ўражваць сваім хараством. Цяжка паверыць, што паміж той асаджанай паўтузінам кранаў раскарэкай, якая мкне ў неба бязліччу сваіх металічных лап (іх вышыня, дарэчы, да канца года павінна скласці каля 30 метраў), і прыгожым, нерэальна-цацачным алмазам (або дыяментам?) на праекце ёсць нейкае падабенства. Тым не менш, гэта менавіта так. І — самае важнае! — падабенства становіцца ўсё больш блізкім літаральна з кожным днём. Алмаз, прыгажосць якога воку проста цяжка ацаніць, пад уздзеяннем умелых рук патроху ператвараецца ў дыямент.

А пакуль нам заставалася толькі пафантазіраваць — непагадзь калі-небудзь скончыцца, наступіць май, і яблыні, што атачаюць бібліятэку, зацвітуць. Вакол будзе прыгожы, дагледжаны парк, і спасцігальнікі ведаў, стаміўшыся ад сваіх заняткаў у прасторных, светлых залах, не будуць адмаўляць сабе ў задавальненні адпачыць на ўтульных лаўках — ды і рэдкая для гараджаніна радасць паваляцца наўпрост на траве для іх, спадзяёмся, застанецца даступнай. Парк стане ўлюбёным месцам для прыватных дыскусій па глабальных філасофскіх ды навуковых пытаннях. А ў гэты час па праспекце будуць праносіцца машыны, якія вязуць замежных гасцей у горад з аэрапорта, і не будзе канца здзіўленню турыстаў, перад вачыма якіх раптам паўстане гмах, што раней мог прымроіцца хіба пісьменніку-фантасту.

Але ж гэта не фантастыка — гэта будучая рэальнасць. Рэальнасць, да паўстання якой спрычыніўся бадай увесь беларускі народ. І менавіта ён неўзабаве стане ейным, калі можна так сказаць, карыстальнікам.

Фота Андрэя СПРЫНЧАНА